# РОЛЯ СРОДКАЎ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ І КІНО Ў КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСКІ (1944–1955 гг.)

*Н.К. Юргевіч*
*Віцебск, УА "ВДАВМ"*

Актуальнасць тэмы даследавання вызначаецца тым, што ў Рэспубліцы Беларусь значная ўвага ўдзяляецца гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, яе вынікам і ўплыву на развіццё краіны ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Характэрнай рысай сучаснай дзяржаўнай палітыкі з'яўляецца пастаянная ўвага да развіцця вёскі, рэалізацыя курсу на павышэнне жыццёвага ўзроўню і культуры сельскіх жыхароў. У сувязі з гэтым уяўляецца актуальным вывучэнне станоўчага і адмоўнага вопыту ў палітыцы дзяржавы ў папярэднія перыяды. Мэта дадзенага артыкула – паказаць праблемы аднаўлення і развіцця сродкаў масавай інфармацыі і кінафікацыі, іх ролю ў культурным будаўніцтве беларускай вёскі ў пасляваенныя гады.

**Матэрыял і метады.** Пры напісанні артыкула былі выкарыстаны афіцыйныя дакументы цэнтральных і рэспубліканскіх партыйных і дзяржаўных органаў, матэрыялы архіваў Рэспублікі Беларусь, статыстычныя зборнікі. У працы выкарыстоўваліся агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе працягвалася аднаўленне і пашырэнне маштабаў дзеяння сродкаў масавай інфармацыі і кіно, іх прыцягненне да культурнага развіцця беларускай вёскі. Першачарговае значэнне ў вобласці палітычнай і культурнай адукацыі сельскага насельніцтва надавалася друку. Ужо 30 верасня 1943 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову "О распространении центральной и республиканской печати в освобождённых районах Белоруссии", якой абязаў упаўнаважанага Наркамсувязі СССР па рэспубліцы арганізаваць дастаўку перыядычнага друку. Са снежня 1944 г. органамі рэспублікі быў арганізаваны выпуск 6 рэспубліканскіх, 11 абласных, 10 гарадскіх, 154 раённых газет [1, с. 85]. Павысілася роля рэспубліканскіх, абласных газет як арганізатараў культработы, пашырыліся іх магчымасці ў асвячэнні праблем культурнага жыцця сяла. Па іх прыкладу паляпшалі свой змест раённыя газеты, якім найбольш былі блізкімі непасрэдныя пытанні аднаўлення сельскай гаспадаркі, пад'ёма культуры працоўных у раёне.

У 1944 г. у Віцебскай вобласці кожная хата-чытальня павінна была выпісваць 15 назваў газет і 20 назваў часопісаў для абслугоўвання калгаснікаў і працоўных вёскі [2, арк. 49]. У наступныя гады колькасць выпісваемай перыядычнай літаратуры патрэбна было павялічыць, хаця ў вясковых умовах вырашыць гэта было вельмі складана. Адмоўна ўплывала на правядзенне падпіскі складанае матэрыяльнае становішча многіх сялян, якім пасля вайны прыходзілася адбудоўваць свае сядзібы і якія часта не мелі магчымасці не толькі выпісаць газету, але і купіць рэчы першай неабходнасці. Такая сітуацыя назіралася ў розных раёнах і абласцях Беларусі ў канцы 1940-х і ў пачатку 1950-х гг.

У 1944–1945 гг. былі праведзены значныя работы па радыёфікацыі гарадоў і вёсак БССР. Менавіта ў разглядаемы перыяд радыё стала больш эфектыўна выкарыстоўвацца ў масавай культурна-асветнай рабоце сярод сялян. У сельскай мясцовасці радыёфікацыя вялася па лініі адкрыцця дзяржаўных і калгасных радыёвузлоў і радыётрансляцыйных ліній. Развіццё радыёсеткі ў сельскай мясцовасці адбывалася за кошт сродкаў калгасаў і саўгасаў. Пэўныя цяжкасці



Рэпазіторый ВДУ

ўзнікалі ў заходніх раёнах рэспублікі, дзе масавая калектывізацыя пачалася толькі ў канцы 1940-х гг., што стрымлівала радыёфікацыю і электрыфікацыю беларускай вёскі. Выконваючы пастанову ЦК УКП(б) «О мерах помощи по развитию радиофикации и радиовещания в западных областях Белорусской ССР», Бюро ЦК КП(б)Б паставіла перад мясцовымі партыйнымі і савецкімі органамі задачу радыёфікаваць у 1945 г. 150 населеных пунктаў, а ў 100 з іх наладзіць прыёмнікі калектыўнага карыстання. Па стану на студзень 1946 г. у рэспубліцы ўжо працавала 197 радыёвузлоў, у тым ліку 52 у сельскай мясцовасці [3, с. 26].

У першыя пасляваенныя гады радыё ўваходзіла ў хаты калгаснікаў вельмі марудна: радыёпрыёмнікаў пасля вайны выпускалася мала, у магазінах іх практычна не было, да іх не прадаваліся запчасткі. Часта атрыманыя культурнымі ўстановамі радыёпрыёмнікі не працавалі з прычыны адсутнасці радыёбатарэй і радыёлямп. Зношанымі былі і радыёвузлы, яны не вытрымлівалі вялікіх магутнасцей. Складанасці з радыёфікацыяй калгасаў і саўгасаў ініцыявалі стварэнне радыёгурткоў пры сельскіх школах, у якіх падлеткі разам з настаўнікамі стваралі самыя простыя (дэтэктарныя) радыёпрыёмнікі для калгаснікаў. У некаторых раёнах Беларусі гарадскія радыёаматары бралі шэфства над калгасамі па вырабе і рамонце дэтэктарных прыёмнікаў.

Важную ролю ў паскарэнні тэмпаў радыёфікацыі абласцей рэспублікі адыграла пастанова ЦК КПБ і СМ БССР ад 15 ліпеня 1954 г. “О мерах по улучшению и дальнейшему развитию радиофикации в сельской местности”, якая абавязала партыйныя і савецкія органы ў 1954–1959 гг. закончыць работу па радыёфікацыі ўсіх калгасаў і саўгасаў. У пастанове ўказвалася на неабходнасць паляпшэння якасці радыёвяшчання. З гэтай мэтай патрабавалася арганізаваць рухомыя рамонтныя майстэрні, стварыць штат тэхнікаў, арганізаваць пункты рамонту радыёпрыёмнікаў.

Прыкметай пасляваенных гадоў з’явілася паступовае ўваходжанне ў быт людзей тэлебачання, але гэта былі толькі першыя крокі. Пагэтаму ў вёсцы іх кампенсавалі кінаперасоўкі. У канцы 1945 г. у рэспубліцы налічвалася 205 кінаўстановак, у тым ліку 178 стацыянарных і 87 рухомых, было адноўлена і працавала 27 кінатэатраў у абласных цэнтрах, 133 у гарадах і раённых цэнтрах і 41 кінатэатр у сельскай мясцовасці [3, с. 25].

Цікавасць калгаснікаў да кіно з кожным годам павялічвалася, хаця большасць памяшканняў для дэманстрацыі кінафільмаў у вёсцы не было прыстасавана. Нягледзячы на тое, што пасля вайны колькасць кінаўстановак у вёсцы пастаянна расла, але ў пачатку1950-х гг. іх мелі 11,4% сельскіх клубаў і хат-чытальнь. Прыезд кінаўстаноўкі ў вёску было вельмі значнай падзеяй для яе жыхароў, бо гэта было вельмі рэдкай з’явай. Патрэбна адзначыць і стратнасць кінаабслугоўвання. Сказвалася дрэннае забеспячэнне транспартам, слабая рэклама, частыя паломкі кінаапаратуры, высокія цэны на пракат фільмаў. У выніку бескантрольнасці ва ўсіх абласцях рэспублікі дасягнуць запланаванага прыбытку не ўдавалася. Так, Віцебскае абласное ўпраўленне кінафікацыі за 1-е паўгоддзе 1951 г. дапусціла страты у суме 392 тыс. руб. [4, спр. 51, арк. 170].

**Заключэнне.** Галоўная роля ў культурным будаўніцтве адводзілася перыядычнаму друку, радыёфікацыі і кінафікацыі, што дазволіла пераадолець адсталасць вёскі ў атрыманні інфармацыі. Пэўныя цяжкасці ўзнікалі ў заходніх абласцях рэспублікі, дзе масавая калектывізацыя пачалася ў канцы 1940-х гг., а значыць, са спазненнем праводзіліся мерапрыемствы па радыёфікацыі і электрыфікацыі – гэтыя работы вяліся намаганнямі калгасаў. У сярэдзіне 1950-х гг. была завершана радыёфікацыя сельскай мясцовасці, але радыё мелі далёка не

Рэпазіторый ВДУ

ўсе сельскія сем'і. Пэўны рост адбыўся ў развіцці кінафікацыі, што звязана з павелічэннем колькасці кінаўстановак у вёсцы (ад 86 у 1945 г. да 1784 у 1955 г.), спецыялістаў, цікавасці вясковага гледача да кіно. Развіццё кінасеткі стрымлівалася недастатковасцю фінансавання, слабасцю матэрыяльнай базы, недахопам кадраў. Таму сельскія культурныя ўстановы не маглі ў поўнай меры набываць радыёпрыёмнікі, часопісы і газеты, што скавалася, у сваю чаргу, і на правядзенні самой культурна-асветнай рабоце ў вёсцы.

Спіс літаратуры

1. Хроника важнейших событий истории Коммунистической партии Белоруссии. Ч.3 (июнь 1941–1965 гг.) / [Г.Г. Белькевич, В.И. Белявцев, А.Н. Гесь и др.]. – Минск: Беларусь, 1980. – 472 с.
2. Материалы о проведении культурно-просветительной работы по Витебской области (13 марта 1944 – ноябрь 1944 гг.) // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 2806. – Воп. 1. – Спр. 2.
3. Культурное строительство в Белорусской ССР (1956-1958гг.)/ АН БССР. Институт истории. – Минск: Наука и техника, 1979. – 224 с.

## РЕГИОНАЛЬНОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ И УКРАИНЫ В 1994–2011 ГОДАХ

*Д.В. Юрчак*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Региональные связи непосредственно граничащих между собой государств всегда занимали особое место в двусторонних отношениях. Не является исключением и белорусско-украинское взаимодействие в постсоветский период. Региональные контакты не всегда зависели от общей политической конъюнктуры, имели свои характерные черты развития, что делает необходимым их рассмотреть отдельно от государственно-политических и экономических контактов. Цель данной работы: проследить развитие региональных связей Беларуси и Украины в период с 1994 по 2011 годы.

**Материал и методы:** При подготовке тезисов использовались публикации ведущих специалистов по данной тематике, материалы СМИ, а также документы Архива Министерства иностранных дел Республики Беларусь. Для обработки материала использовались как общенаучные, так и частные методы исторической науки.

**Результаты и их обсуждение.** С 1994 г. новый импульс приобрели региональные связи. Это было обусловлено тем, что возникшие после распада СССР сложности, связанные с непониманием сложившейся ситуации и неумением развивать сотрудничество в новом формате, отчасти были преодолены. Кроме того, приход к власти в обеих странах в июле 1994 г. лидеров-прагматиков также положительно повлиял на развитие регионального сотрудничества.

Ещё в июле 1995 г. на встрече руководителей исполкомов 19 областей Беларуси, России и Украины было принято совместное обращение к руководителям государств, в котором содержалось заявление о поддержке интеграционных устремлений. В 1997 г. между Минском и Киевом подписано соглашение о сотрудничестве, определившее основные направления взаимодействия двух столиц. 12 мая 1997 г. в Киеве руководители двух государств подписали Соглашение о сотрудничестве приграничных областей, что заложило правовую основу под свя-

Репозиторий ВГУ